УДК 070(476)«1929/1939»

# ПУБЛІЦЫСТЫКА МАКСІМА ТАНКА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА ПЕРЫЯДУ: ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ

***Г. К. ТЫЧКО***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Абгрунтоўваецца неабходнасць актуалізацыі даследаванняў феномена заходнебеларускай перыёдыкі на прыкладзе аналізу публіцыстычнай спадчыны Максіма Танка. Разглядаецца гісторыя заходнебеларускага друку ў 1929–1939 гг. На падставе вывучэння публіцыстычных матэрыялаў Максіма Танка вызначаюцца тэматычныя і жанравыя асаблівасці тэкстаў. Аналізуецца ўплыў гістарычнага кантэксту на эстэтычныя і каштоўнасна-маральныя дамінанты тагачаснага перыядычнага друку. Вылучаюцца прычыны ўзнікнення супярэчлівых падыходаў да ацэнкі мастацкіх твораў. Робяцца высновы аб прыярытэтнай ролі аўтарскай грамадзянскай пазіцыі ў журналісцкіх публікацыях.

***Ключавыя словы:*** заходнебеларуская перыёдыка; публіцыстычныя тэксты; жанры мастацкай публіцыстыкі; гістарычны кантэкст; грамадзянская пазіцыя.

# ПУБЛИЦИСТИКА МАКСИМА ТАНКА ЗАПАДНОБЕЛОРУССКОГО ПЕРИОДА: ЖАНРОВО-ТЕМАТИЧЕСКИЕ ДОМИНАНТЫ

***Г. К. ТЫЧКО***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Обосновывается необходимость актуализации исследований феномена западнобелорусской периодики на примере анализа журналистского наследия Максима Танка. Рассматривается история западнобелорусской прессы в 1929–1939 гг. На основе изучения публицистических материалов Максима Танка определяются тематические и жанровые особенности текстов. Анализируется влияние исторического контекста на эстетические и ценностно-нравственные доминанты периодической печати того времени. Выделяются причины появления противоречивых подходов к оценке произведений искусства. Делаются выводы о приоритетной роли гражданской позиции автора в журналистских публикациях.

***Ключевые слова:*** западнобелорусская периодика; публицистические тексты; жанры художественной публицистики; исторический контекст; гражданская позиция.

**Образец цитирования:**
Тычко ГК. Публіцыстыка Максіма Танка заходнебеларускага перыяду: жанрава-тэматычныя дамінанты. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2025;2:35–40.
EDN: SDRKED

**For citation:**
Tychko HK. Publicism of Maxim Tank in the Western Belarusian period: genre and thematic dominants. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2025;2:35–40. Belarusian.
EDN: SDRKED

**Автор:**
***Галина Казимировна Тычко*** – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики.

**Author:**
***Halina K. Tychko***, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism.
*tychko@mail.ru*
*https://orcid.org/0000-0002-9379-924X*

CC BY NC

Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. 2025;2:35–40
Journal of the Belarusian State University. Journalism. 2025;2:35–40

# PUBLICISM OF MAXIM TANK IN THE WESTERN BELARUSIAN PERIOD: GENRE AND THEMATIC DOMINANTS

***H. K. TUSHKO*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The necessity of updating the research of the phenomenon of Western Belarusian periodicals is substantiated using the example of the analysis of the publicistic heritage of Maxim Tank. The history of the Western Belarusian press in 1929–1939 is considered. Based on the analysis of Maxim Tank's publicistic materials, the thematic and genre features of the texts are determined. The influence of the historical context on the aesthetic and value-moral dominants of the periodical press of that time is analysed. The reasons for contradictory approaches to the assessment of works of art are considered. Conclusions are made about the priority role of the author's civic position in journalistic publications.

***Keywords:*** Western Belarusian periodicals; publicistic texts; genres of artistic publicism; historical context; civic position.

## Уводзіны

Жыццёвы і творчы шлях народнага паэта Беларусі Максіма Танка (пры нараджэнні Яўгена Іванавіча Скурко (1912–1995)) у першай палове XX ст. непарыўна звязаны з гісторыяй Заходняй Беларусі, якая ў той перыяд знаходзілася ў складзе 2-й Рэчы Паспалітай. «Да Польшчы паводле ўмоў Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. адышла амаль палова этнічнай тэрыторыі Беларусі плошчай 98 815 кв. км» (цыт. па [1, с. 102]). Толькі 15 сакавіка 1923 г. Савет Лігі Нацый афіцыйна прызнаў усходнюю мяжу Польшчы, што сведчыць аб спрэчнасці гэтай мяжы. Для абгрунтавання правамернасці ўключэння «"паўночна-ўсходніх зямель" у склад польскай дзяржавы ў час урадавага перапісу 30 верасня 1921 г. былі штучна заніжаны даныя аб колькасным ліку беларускага насельніцтва» [1, с. 102]. Насамрэч «на тэрыторыі Заходняй Беларусі, што складалася з 29 паветаў і займала плошчу 113 км$^2$ пражывала на 1931 год 4,6 млн чалавек»[1]. У перыяд паміж сусветнымі войнамі культурным і палітычным цэнтрам Заходняй Беларусі стаў горад Вільня. Тут былі заснаваны найбольш уплывовыя беларускія палітычныя аб'яднанні, культурныя суполкі і нацыянальна скіраваныя грамадскія арганізацыі. Шматлікія беларускамоўныя газеты і часопісы Вільні (іх было некалькі дзясяткаў) асвятлялі палітычныя, эканамічныя і культурныя перспектывы развіцця этнічна беларускіх тэрыторый у складзе Польшчы.

## Асноўная частка

Максім Танк жыў у Вільні ў 1929–1939 гг. Гэта дзесяцігоддзе было надзвычай важным для яго грамадзянскага, духоўнага і літаратурнага сталення. У той час фарміруецца яго творчая індывідуальнасць, якая спалучае іпастасі паэта і барацьбіта за нацыянальныя інтарэсы беларускага народа. Публіцыстычны пафас яго ранніх твораў выяўляўся ў адстойванні правоў беларусаў у складзе польскай дзяржавы афіцыйна карыстацца роднай мовай, атрымліваць адукацыю на беларускай мове і, кажучы словамі Янкі Купалы, «людзьмі звацца» – мець нацыянальную незалежнасць: *Калі няма на свеце маёй мовы, / Майго народа і мяне самога, – / Дык для каго будуеце, панове, / Канцлагеры, катоўні і астрогі? <...> / Супроць каго рыхтуеце вы змовы / З прадажнымі і юдамі і богам, – / Калі няма на свеце маёй мовы, / Майго народа і мяне самога!* [2, с. 30].

Паэтычная публіцыстыка была надзвычай істотным аспектам творчасці маладога Максіма Танка. Аднак не менш важным аспектам яго дзейнасці заставалася і слова, апублікаванае на старонках тагачасных заходнебеларускіх перыядычных выданняў і газет-аднадзёнак. Перыядам існавання заходнебеларускага друку лічацца 1920–30-я гг. Легальныя і падпольныя перыядычныя выданні літаратурна-грамадскага, грамадска-палітычнага, канфесійнага, сатырычнага кірунку ў той час тут былі шматмоўнымі. Яны выходзілі на беларускай, рускай, польскай, літоўскай, яўрэйскай мовах. Агульная колькасць гэтай перыёдыкі за 1921–1939 гг. складала каля 270 адзінак, у лік якіх уваходзілі прыблізна 70 газет-аднадзёнак[2]. Газеты і часопісы выдаваліся рознымі грамадска-палітычнымі арганізацыямі, і геаграфія іх выхаду ў свет (Беласток, Брэст, Гродна, Варшава, Берлін і іншыя гарады) уражвала. Аднак цэнтр развіцця тагачаснай беларускамоўнай перыёдыкі знаходзіўся, безумоўна, у Вільні. Асноўная скіраванасць такіх выданняў была прагматычнай: яны заклікалі да барацьбы за сацыяльныя і нацыянальныя інтарэсы беларусаў у межах 2-й Рэчы Паспалітай, а таксама да ўз'яднання з БССР.

Выдавецкая дзейнасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі актывізавалася ў другой палове 1920-х – першай палове 1930-х гг. Найбольш уплывовымі засна-

[1]Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 3 / гал. рэд. Г. П. Пашкоў. Мінск : БелЭн, 1996. С. 421.
[2]*Говін С. В.* Заходнебеларускі друк // Беларус. энцыкл. : у 18 т. Т. 7 / гал. рэд. Г. П. Пашкоў. Мінск : БелЭн, 1998. С. 13.

вальнікамі тагачаснай перыёдыкі былі Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада (газеты «Жыццё беларуса», «Беларуская ніва», «Беларуская справа», «Народная справа», «Наша справа», «Наш голас», «Наша воля», «Наша праўда», «Народны звон», сатырычны часопіс «Маланка» і інш.), Таварыства беларускай школы (газеты «Наш палетак», «Шлях», часопіс «Беларускі летапіс», выданні «Інфармацыйны бюлетэнь ТБШ», «Бюлетэнь ТБШ» і інш.), якія выступалі за развіццё беларускай мовы, культуры, мастацтва, арганізацыю школ з выкладаннем на роднай мове. Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый выдаваў газеты «Наперад», «Беларускі звон», «Народны звон», часопіс «Саха». Выходзілі таксама шматлікія канфесійныя выданні: часопісы «Праваслаўны беларус», «Светач Беларусі», «Голас праваслаўнага беларуса», «Царква і народ», «Светач хрыстовае навукі», «Беларуская крыніца», «Хрысціянская думка». Уніяцкая царква выдавала часопіс «Do złuczenia» («Да злучэння»). Акрамя таго, выходзілі разнастайныя літаратурныя і маладзёжныя выданні, сатырычныя часопісы і часопісы для жанчын.

Большасць выданняў друкаваліся кірыліцай, лацінка ўжывалася радзей. Ступень свабоды выдаўцоў заходнебеларускай прэсы цалкам адпавядала ўнутрыпалітычным законам 2-й Рэчы Паспалітай. «Згодна з польскім законам журналісты мелі права не падпісваць свае артыкулы, таму вялікая колькасць вострых палітычных матэрыялаў публікаваліся без імёнаў ці псеўданімаў аўтараў. Пры аналізе віленскай прэсы гэты факт значна ўскладняе працу гісторыкаў, бо ў большасці выпадкаў на сённяшні дзень аўтарства ўзнавіць проста немагчыма. Разам з тым крымінальная адказнасць за выхад прэсы ўскладалася на рэдактара ці выдаўца перыёдыкі, які меў права не называць аўтара» [3, с. 37]. Гэтымі абставінамі ў многім і тлумачацца цяжкасці з аднаўленнем журналісцкіх матэрыялаў, апублікаваных Максімам Танкам у заходнебеларускіх выданнях.

Праца Максіма Танка ў галіне журналістыкі пачалася ў першыя гады яго жыцця ў Вільні. У аўтабіяграфіі паэт так прыгадвае гэты час: «Літаратурны журнал “Пралом”. Першы нумар у двух экземплярах быў надрукаваны ад рукі мной і быўшым вучнем беларускай гімназіі І. Гарохам. <…> У 1931 г. спрабавалі мы выдаваць легальны літаратурна-палітычны журнал “Часопіс для ўсіх”, дзе пад рознымі псеўданімамі (Д. Сівер, А. Граніт, Віктар) былі змешчаны мае творы, але журнал быў забаронены польскай цэнзурай адразу пасля выхаду першага нумара, а таксама была канфіскавана і беларуская легальная камуністычная газета “На пераломе”, якая выдавалася ў Львове, дзе ўпершыню пад псеўданімам М. Танк быў надрукаваны ў 1932 г. мой верш аб забастоўцы шахцёраў…»[3] [4, с. 282]. Знаходзячыся ў Лукішскай турме ў канцы 1933 г., Максім Танк пачынае выдаваць рукапісны часопіс «Краты» (выйшлі шэсць нумароў). З другой паловы 1930-х гг. паэт працуе ў беларускіх і польскіх часопісах і газетах, якія адлюстроўваюць погляды прадстаўнікоў народнага фронту, вядзе беларускую калонку ў польскім часопісе «Папросту», потым узначальвае літаратурны аддзел у газеце «Наша воля», супрацоўнічае з рознымі заходнебеларускімі выданнямі, сярод якіх часопісы «Беларускі летапіс», «Шлях моладзі», «Калоссе» і інш.[4] Аднак калі меркаваць па даступнай на сёння апублікаванай спадчыне паэта (змешчана ў восьмым томе збору твораў Максіма Танка), плён гэтай амаль дзесяцігадовай працы даволі сціплы.

Пад рубрыкай «Нарысы» ў гэтым томе змешчаны ўсяго чатыры матэрыялы, датаваныя 1935–1937 гг. Усе яны ўзноўлены па публікацыях у газеце «Наша воля», часопісах «Шлях моладзі» і «Беларускі летапіс». Газета «Наша воля» выдавалася з 24 снежня 1935 г. да 23 жніўня 1936 г. у Вільні на беларускай мове раз на два тыдні. Выдаўцом і рэдактарам быў беларускі грамадска-культурны дзеяч Вінцэсь Склубоўскі. Тут пад псеўданімам Максім Танк былі апублікаваны два матэрыялы «Там, дзе азёры. Летні нарыс з-пад Нарачы» і «Дыскусія над праграмай беларускіх нацаў. Абразок з натуры». Выданне «Шлях моладзі», дзе была змешчана публікацыя «У дарозе (шкіцы з Наваградчыны)», уяўляла сабой маладзёжны грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс, які выдаваўся ў Вільні ў 1929–1939 гг. на беларускай мове лацінкай і кірыліцай. Спачатку ён выходзіў раз на месяц, а з верасня 1937 г. – два разы на месяц і быў адным з найбольш запатрабаваных выданняў у Заходняй Беларусі. Рэдактарамі часопіса ў розныя перыяды былі М. Пецюкевіч, Я. Найдзюк, Я. Шутовіч, а выдаўцом – беларускі празаік, паэт, публіцыст, мемуарыст Я. Багдановіч. Матэрыял «Як зелянее зямля. Нарыс з дарогі» Максім Танк апублікаваў ў часопісе «Беларускі летапіс» (да снежня 1936 г. выданне мела назву «Летапіс Таварыства беларускай школы»). Гэты штомесячны культурна-грамадскі і літаратурны часопіс быў заснаваны як орган Таварыства беларускай школы і выходзіў у Вільні з мая 1933 г. па верасень 1939 г. (у 1934–1935 гг. часопіс не выдаваўся з-за рэпрэсій польскіх улад). З 1937 г. Максім Танк уваходзіў у рэдкалегію часопіса.

Безумоўна, усе вышэйпералічаныя публікацыі Максіма Танка не трапляюць цалкам у жанравыя рамкі нарыса, хаця ў некаторых з іх і зафіксавана такое аўтарскае вызначэнне. Найбольш гэтыя матэрыялы адпавядаюць фармату аўтарскай калонкі з даволі размытымі жанравымі канонамі, у іх ёсць элементы розных жанраў – ад замалёўкі з натуры

[3]Тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем асаблівасцей арыгінала. – *Г. Т.*

[4]Гл.: *Тычко Г. К.* Максім Танк у гісторыі заходнебеларускай журналістыкі // Журналістыка-2024: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 26-й Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 22 лістап. 2024 г.) / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. В. Бяляеў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2024. С. 267–270.

і абразка да рэпартажу. Усім згаданым публікацыям уласцівы ярка выяўлены суб'ектыўны падыход да асвятлення рэчаіснасці, публіцыстычна завостраная грамадзянская пазіцыя аўтара і шырокае выкарыстанне вобразна-выяўленчых сродкаў, найперш іранічна-саркастычнага характару. Паводле ідэйна-тэматычнага зместу разглядаемыя творы адносяцца да палітычнай публіцыстыкі, скіраванай на выкрыццё (найчасцей праз супрацьпастаўленне багатых польскіх паноў і бедных беларускіх сялян) заган сацыяльнай і нацыянальнай палітыкі 2-й Рэчы Паспалітай у дачыненні да Заходняй Беларусі:

*Ёсць два берагі.*

*Адзін – гарыць на сонцы, звініць меднымі струнамі соснаў, а ў цені маляўніча раскінуліся дачныя домікі, рэстараны, уюцца між олянцовых кустоў дарожкі, старанна высыпаныя жоўтым пяском.*

*Другі бераг: цягнуцца вузкія шнуры; ляжыш – галава на адной мяжы, лапці на другой. У беспарадку каля дарогі збіліся сялянскія хаткі, быццам сабраліся кудысьці ісці* [5, с. 33].

Палітычная скіраванасць і публіцыстычны запал заўважны і ў тагачаснай паэтычнай творчасці Максіма Танка. У пэўнай ступені наследуючы У. Маякоўскага, якога ён лічыў сваім кумірам[5], малады паэт імкнецца паставіць на службу грамадскасці і сваё мастацкае слова. Ён публікуе свой праграмны творчы маніфест пад назвай «З пісьма ад Апалона» ў № 13 часопіса «Новы шлях» за 1936 г.: *Народу трэба песьня – плуг / з якой ўзараў бы межы ён; / якой бы мог падняць абух, / разьбіць прашкоды цемры ў пух / і класьці сьцежкі сьвежыя*[6].

Гэта публікацыя не засталася без увагі ў тагачасным культурным асяроддзі Заходняй Беларусі і стала пачаткам дыскусіі аб прызначэнні паэзіі, ролі паэта ў грамадстве і праве на існаванне паэзіі «чыстай красы» (у пэўнай ступені гэта быў своеасаблівы працяг славутай нашаніўскай дыскусіі, распачатай у 1913 г. артыкулам Юркі Верашчакі «Сплачвайце доўг»). Амаль адразу ж у № 1 газеты «Беларускі фронт» за 1937 г. быў змешчаны артыкул «Мэты паэзіі», падпісаны крыптанімам Ш. У ім аўтар палемізуе з Максімам Танкам.

Выданне «Беларускі фронт» было незалежнай народна-радыкальнай газетай, якая выходзіла на беларускай мове ў Вільні ў 1936–1939 гг. штомесячна, а ў 1939 г. два разы на месяц. Яе адказным рэдактарам быў каталіцкі святар, грамадскі дзеяч і публіцыст В. Гадлеўскі. У склад рэдкалегіі, апрача яго, уваходзілі Л. Дубейкаўскі, В. Пануцэвіч, М. Шкялёнак. Мяркуецца, што аўтарам артыкула «Мэты паэзіі» якраз і быў беларускі гісторык М. Шкялёнак. Існуе яшчэ адна версія, паводле якой за крыптанімам Ш. хаваўся літаратуразнаўца і публіцыст, адказны рэдактар часопіса «Калоссе», член рэдкалегіі часопіса «Шлях моладзі» Янка Шутовіч [5, с. 578].

Публікацыя Ш. узрушыла і абурыла Максіма Танка, сведчаннем чаму стаў яго палемічны артыкул пад назвай «Адказ на артыкул быццам аб паэзіі, змешчаны ў "Бел. Фронце" № 1(10) п<ад> н<назвай> "Мэты паэзіі" Ш.». Свой адказ Максім Танк апублікаваў у № 1 часопіса «Шлях моладзі» за 1937 г. Максім Танк піша: «І заўсёды, калі ворагі хочуць зменшыць значэнне паэзіі ў жыцці, дык б'юць па яе змесце, па яе сувязях з народам. Праўда, яны гэта робяць у імя "вышэйшага мастацтва", і ў імя іншых падобных інстытуцый, але мэта тая самая – адарваць паэзію ад жыцця, гэтым самым прытупіць яе лязо, настаўленае супраць падобных "апекуноў". Як відаць, і ў жрацоў "чыстай паэзіі" не зусім чыстыя заплеччы. Не кажучы ўжо аб руках» [5, с. 186]. І ўсё ж ні такія гучныя словы, ні такія сур'ёзныя абвінавачанні не пераканалі нават самых блізкіх саратнікаў Максіма Танка. У тым жа самым нумары часопіса «Шлях моладзі», дзе быў апублікаваны згаданы артыкул, прызнаны і аўтарытэтны ў заходнебеларускіх колах паэт Міхась Машара друкуе «Адказ на пісьмо ад Апалона»: *О, Апалон! Зайздросны божа... / Чым так разгневаны на нас? / Чаму наш сьпеў цябе трывожа? / Чаму бароніш так парнас? / Мелёдый дзіўных бог магутны, / Пяяў красу жыцьця вякі, / А сёньня гнеўна і кіпуча / Пяеш пра бруд і «трыбухі»*[7].

Варта адзначыць, што мастацкая публіцыстыка найбольш паслядоўна і грунтоўна прадстаўлена ў апублікаванай спадчыне Максіма Танка. Найперш гэта літаратурна-крытычныя артыкулы «Крыніцы нашай творчасці» і «Літаратурны маладняк і крытыка», надрукаваныя ў № 2, 4–5 часопіса «Беларускі летапіс» за 1938 г. адпаведна. У першым артыкуле аналізуюцца роля і спосабы выкарыстання вуснай народнай творчасці ў беларускай паэзіі. Другі артыкул уяўляе сабой агляд, дзе Максім Танк разважае пра тагачасны літаратурны працэс у Заходняй Беларусі, асаблівую ўвагу надаючы маладым творцам, мастацкія здабыткі якіх ён ацэньвае даволі высока, супрацьпастаўляючы іх «мяшчанскай» плыні. Перад маладняком ён ставіць грандыёзную задачу: «...даць творчасць не "аб адраджэнні", а даць творчасць адраджэння» [5, с. 198].

Матэрыял Максіма Танка «Міхась Васілёк», які з'яўляецца творчым партрэтам аднаго з вядучых тагачасных заходнебеларускіх паэтаў, змешчаны ў № 5 часопіса «Беларускі летапіс» за 1937 г. Максім Танк, характарызуючы творчасць Міхася Васілька, падкрэслівае яго грамадзянскую пазіцыю: «Паэт

[5] Гл.: *Тычко Г. К.* Даверасьнёўская творчасць Максіма Танка ў кантэксце эстэтычных пошукаў славянскай паэзіі // Сёмыя Танкаўскія чытанні да 95-годдзя Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка : зб. навук. арт. Мінск, 2010. С. 150–155.

[6] *Максім Танк.* З пісьма ад Апалона // Шлях моладзі. 1936. № 13. С. 2.

[7] *Міхась Машара.* Адказ на пісьмо ад Апалона // Шлях моладзі. 1937. № 1. С. 20.

пільна ўглядаецца ў супярэчнасці нашага жыцця, стараецца знайсці выхад і бачыць яго ў справядлівым вырашэнні ўсіх сацыяльных і нацыянальных пытанняў» [5, с. 188].

У пэўнай ступені сацыялагізатарскі падыход характэрны таксама і для рэцэнзій Максіма Танка, якія ён з 1936 г. змяшчае ў газеце «Наша воля» – друкаваным органе Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якая выдавалася з 24 снежня 1935 г. да 23 жніўня 1936 г. Максім Танк публікуе тут дзве рэцэнзіі на паэму Міхася Машары «Падарожжа», надрукаваную ў № 1 і 2 часопіса «Калоссе» за 1936 г. Назвы матэрыялаў выразныя: «Падарожжа і бездарожжа» і «Досыць бездарожжа». Галоўныя прэтэнзіі рэцэнзента да паэта заключаюцца ў наступным: «Машара не патрафіў належна выкарыстаць той матэрыял, які меў пад рукой. З шырокага палатна светапогляднаграмадскага ён выразаў кавалкі, якімі залатаў шмат дзе працёрты жыццёвы падарожніцкі рахітычны светапогляд, даў слабыя шкіцы, але не вобраз, месцамі фактаграфічнае клішэ свайго “я”, якое нат не здае сабе справы, з тых гістарычных падзей, якія сёння адбываюцца» [5, с. 364]. Безумоўна, такая ацэнка паэзіі Міхася Машары была несправядлівай і ў многім вульгарызатарскай. Заходнебеларуская культурная эліта не падтрымала яе, нават абурылася публікацыяй Максіма Танка. Так, у абарону Міхася Машары на старонках часопіса «Шлях моладзі» ў рубрыцы «Палемічныя заценкі» выступіў тагачасны рэдактар выдання Я. Найдзюк: «Бараніць Машары ад Танкавай крытыкі мы ня будзем, бо яна плыткая, вузкая, злосная, беспадстаўная, некультурная. Агулам Танк чамусьці надта вузка ўсё бярэ і хоча ў кожным творы бачыць толькі праграмы, клясавасць і партыйнасць і панад гэта не можа падняцца. <…> Машара шукае наўперад чалавека беларуса, справа Беларусі якому ёсць блізкай, а не тых ці іншых партыйцаў»[8].

З пазіцый класавай запатрабаванасці ацэньваецца таксама творчасць Міхася Машары, у прыватнасці, яго зборнік «З-пад стрэх саламяных» (1937), у рэцэнзіі Максіма Танка «Стрэхі за гасцінцам», надрукаванай у № 8 часопіса «Беларускі летапіс» за 1937 г. Аднак тут рэцэнзент больш стрыманы і аб’ектыўны. Адзначаючы, што ў Міхася Машары «месцамі зазначыўся адрыў ад сённяшняга дня», ён усё ж падкрэслівае эстэтычныя вартасці лірыкі паэта, сцвярджаючы, што «найбольш поўным і найбольш закончаным Машара выяўляецца ў сваей лірыцы» [5, с. 372–373].

Значную цікавасць уяўляе літаратурна-крытычны артыкул Максіма Танка «Да справы перакладаў мастацкае літаратуры», апублікаваны ў № 2 часопіса «Калоссе» за 1939 г., які выдаваўся ў Вільні на беларускай мове з 1935 па 1939 г. Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры. У ім змяшчаліся матэрыялы па беларускай гісторыі, сацыяльнай псіхалогіі, краязнаўстве, беларускай мове і літаратуры, культуры. Ва ўступным артыкуле да № 1 за 1935 г. рэдакцыя абяцае звярнуць асаблівую ўвагу на «аддзел прыгожай літаратуры», не абмяжоўвацца публікацыяй твораў з Заходняй Беларусі, цікавіцца тым, што развіваецца па той бок мяжы, рабіць передрукі важнейшых і найбольш характэрных твораў паэтаў і пісьменнікаў БССР, каб аўтары-пачаткоўцы мелі «перад сабой цікавыя ўзоры передусім у галіне стылю, тэхнікі і паэтыцкае мовы» [6, с. 81]. Варта адзначыць, што рэдакцыя сваё слова стрымала. І на старонках часопіса з’яўляліся публікацыі беларускіх савецкіх вучоных, напрыклад артыкул М. Ларчанкі і Л. Фіглоўскай «Новыя матэрыялы аб беларускай літаратуры XIX стагоддзя», перадрукоўваліся творы беларускіх савецкіх паэтаў (Паўлюк Трус), аналізавалася іх творчасць (грамадска-палітычны нарыс Я. Кургана пра асобу і паэзію У. Дубоўкі «У дзесятыя сумныя ўгодкі»).

Артыкул Максіма Танка пра неабходнасць і спецыфіку перакладаў твораў з блізкароднасных моў – рускай, украінскай, польскай – якраз адпавядае заяўленым патрабаванням. Мастацкі пераклад да сённяшняга дня быў і застаецца адным з самых складаных аспектаў літаратурнай творчасці, асабліва калі гаворка ідзе пра пераклады паэзіі. Свае развагі аўтар артыкула падмацоўвае ўласным прыкладам: прыводзіць строфы са свайго перакладу верша А. Пушкіна «Анчар».

## Заключэнне

Публіцыстычная спадчына Максіма Танка (калі не браць пад увагу яго паэтычную публіцыстыку) да верасня 1939 г., на першы погляд, у тэматычным і жанравым дыяпазонах не вельмі разнастайная. Аднак, разглядаючы яе, неабходна ўлічваць гісторыка-палітычны кантэкст жыцця заходнебеларускага грамадства і асаблівасці функцыянавання тагачаснай медыяпрасторы. Многія публіцыстычныя медыйныя тэксты Максіма Танка друкаваліся пад рознымі псеўданімамі ў розных выданнях, асобныя нумары некаторых з якіх на сёння ў архівах адсутнічаюць. Абставінамі асабістага жыцця тлумачыцца ў многім і ідэйны пафас тагачаснай публіцыстыкі Максіма Танка (з 1932 г. пасля няўдалага пераходу польска-беларускай мяжы Максім Танк працаваў інструктарам ЦК камсамола Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, і яго журналісцкая дзейнасць была часткай партыйнага задання). Канешне, пытанні нацыянальнага вызвалення, уз’яднання беларусаў у адзінай дзяржаве былі для яго першаступенна важнымі, аднак і ў паэзіі, і ў сваіх літаратурна-крытычных артыкулах ён выяўляўся больш арыгінальна і ярка тады, калі пераадольваў сацыяльны дыдактызм і маралізатарства.

[8] *J. n.* «Не стары» – Максім Танк – Міхась Машара // Шлях моладзі. 1936. № 6. С. 14.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ладысеў УФ. Беларускае пытанне ў Другой Рэчы Паспалітай. 1919–1939 гг. У: Яноўскі АА, рэдактар. *Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Том 2, Гісторыя. Філалогія. Журналістыка*. Мінск: БДУ; 2001. с. 101–108.

2. Максім Танк. *Збор твораў. Том 1, Паэзія 1930–1939*. Мінск: Беларуская навука; 2006. 642 с.

3. Сарока ПВ. Умовы развіцця польскага і беларускага перыядычнага друку на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1920–1939 гг.). В: Проневич АФ, редактор. *Наука-2009. Часть 2*. Гродно: Гродненский государственный университет имени Янки Купалы; 2009. с. 37.

4. Калядка СУ. *Максім Танк: новыя факты, матэрыялы, інтэрпрэтацыі*. Мінск: Беларуская навука; 2014. 485 с.

5. Максім Танк. *Збор твораў. Том 8, Празаічныя творы. Артыкулы. Выступленні. Рэкамендацыі, некралогі*. Мінск: Беларуская навука; 2009. 642 с.

6. Трус МВ. Часопіс «Калоссе» і віленска-мінскі медыйны і архіўна-літаратурны дыскурсы другой паловы 1930-х гг. *Труды БГТУ. Серия 4, Принт- и медиатехнологии*. 2022;1:80–85.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 18.02.2025.*
*Received by editorial board 18.02.2025.*